# Вучэбная дысцыпліна «Культура маўлення педагога»

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 0113 -02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)<br>Дысцыпліна кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі<br>Модуль "Сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны – 2" |
| **Кароткі змест** | Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей. Мова і соцыум. Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму. Моўная інтэрферэнцыя і яе віды. Арфаграфічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Лексіка беларускай мовы. Беларуская тэрміналагічная лексіка. Тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі. Паняцце і класіфікацыя функцыянальных стыляў. Асноўныя рысы навуковага стылю. Кампазіцыя, афармленне і рубрыкацыя навуковага тэксту. Асноўныя рысы афіцыйна-справавога стылю. Віды афіцыйна-справавых тэкстаў, правілы іх напісання і афармлення. Культура прафесійнага маўлення. Маўленне – маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Правільнасць маўлення і моўныя нормы. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:** гісторыю развіцця і фарміравання нормаў і стыляў беларускай мовы; развіццё і станаўленне функцыянальных стыляў сучаснай беларускай літаратурнай мовы; класіфікацыю камунікатыўных якасцей сучаснай беларускай мовы; агульныя і спецыяльныя сродкі выяўленчай выразнасці маўлення; **умець:** выкарыстоўваць форму, змест і функцыю моўнай адзінкі, вызначаць тоеснасць яе з іншымі адзінкамі мовы;прымяняць веды аб будове маўленчай сітуацыі; правільна будаваць тэкст любога стылю і тыпу; валодаць сродкамі тэхнічнай выразнасці пісьмовага маўлення.<br>Засваенне праграмы павінна забяспечыць фарміраванне кампетэнцый:<br>СК-10 Выкарыстоўваць пры стварэнні вусных і пісьмовых тэкстаў камунікатыўныя стратэгіі і тактыкі як мэтанакіраваны від дзейнасці |
| **Прэрэквізіты** | Сучасная беларуская мова, рыторыка, культура маўлення |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін па дысцыпліне – 72 (2 заліковыя адзінкі). Колькасць аўдыторных гадзін – 36, з іх лекцыйных – 10, практычных – 26. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 4 семестр, тэставыя заданні, залік. |